Ляшчонак, Н. «Лёс даў нам такога дырэктара» : [успаміны аўтара пра б. дыр. Рэспубліканскага музея гісторыі рэлігіі, бел.пісьменніка Аляксея Карпюка] / Н. Ляшчонак // Звязда. – 2015. – 24 красавіка. – С.17.

**«Лёс даў нам такога дырэктара» // Звязда : сайт газеты. – Рэжым доступу:**
http://www.zviazda.by/be/news/20150424/1429825873-lyos-dau-nam-takoga-dyrektara

- 24.04.2015 00:51
- **Гісторыя і Этнаграфія**, **Зваротная сувязь**

**Шчыры дзякуй газеце за артыкул «Вяртанне старажытнага вадаліва», змешчаны ў нумары за 2 красавіка.**

Нам сапраўды пашчасціла ў жыцці: вядомы беларускі пісьменнік Аляксей Нічыпаравіч Карпюк некалькі гадоў быў дырэктарам Рэспубліканскага музея гісторыі рэлігіі. Ствараючы яго і потым папаўняючы экспанатамі, мы аб'ездзілі амаль усю Беларусь, збіралі абразы, жывапіс, дакументы, старадрукі, паштоўкі з выявамі культавых будынкаў...

У нашым музейным жыцці не абышлося без недарэчнасцяў, нам сустракаліся выпадковыя, далёкія ад мастацтва людзі. Адзін з іх, напрыклад, ацэньваючы сучасны твор вядомага беларускага мастака, з разумным тварам казаў: «Так, сюжэт на графіку падобны». Другая — пра вадаліў XII стагоддзя гаварыла, што яна такую рэч сабе «ў сервант не паставіла б». Трэці лямантаваў: «Навошта вам тыя слуцкія паясы! Ды ў кожнай вёсцы натчэ іх кожная бабуля». І толькі дырэктар музея супакойваў нас, казаў: «Ну, што вы хвалюецеся! Неадукаваныя людзі. Іх трэба вучыць, дык вы і вучыце...»

Аляксей Нічыпаравіч — гэта асаблівая старонка ў гісторыі музея ў Гародні. Ён быў нашым першым дырэктарам, нашым бацькам, сябрам, паплечнікам. Ён вучыў нас збірацца ў камандзіроўку за хвіліны, у экспедыцыю — за некалькі гадзін. Ён быў эталонам учынкаў і паводзінаў. Ён вучыў нас глядзець і бачыць, думаць і аналізаваць, вучыў любіць нашу справу.

Ён усё рабіў хутка, нічога не адкладваў на потым і ніколі не быў стомленым ці хворым... А як ён размаўляў! Як мог пасмяяцца! Якой бліскучай і высакароднай была яго мова! Усе святы ў музеі мы адзначалі разам з нашым дырэктарам. Ён апекаваў нас, клапаціўся, знаёміў з пісьменнікамі і мастакамі, з цікавымі людзьмі.

Нам дужа пашанцавала: лёс звёў нас з такім чалавекам, такім кіраўніком!.. Сёлета 14 красавіка Аляксею Нічыпаравічу споўнілася б 95.

**Ніна Ляшчонак, былы галоўны захавальнік Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі,** *г. Гродна*

*Ніна ЛЯШЧОНАК, навуковы супрацоўнік*
*Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі*

*Узяты з кнігі: Карпюк, А. Выбраныя творы / А. Карпюк. – Мінск, 2007.– 600 с. – (Беларускі кнігазбор : Серыя 1. Мастацкая літаратура).*

## *ЗАЎТРА ЗАЎСЁДЫ ПОЗНА*

Аляксей Нічыпаравіч Карпюк! Гэта асаблівая старонка ў гісторыі музея.

Ён быў нашым першым дырэктарам у Горадні, нашым бацькам, сябрам, паплечнікам.

Ён навучыў нас шырыні мыслення, самастойнасці і незалежнасці, чаго потым нам не маглі дараваць.

Ён навучыў нас не баяцца міністраў і чыноўнікаў. Ён навучыў нас збірацца ў камандзіроўку за хвіліны, у экспедыцыю — за некалькі гадзін.

Ён быў для нас эталонам учынкаў і паводзінаў. Ён ніколі не патра баваў вынікаў працы, ён давяраў нам і верыў у нас.

Ён навучыў нас глядзець, бачыць, думаць і аналізаваць, навучыў любіць нашу справу. Ён не цярпеў маруднасці, тугадумства, быў як маланка, здавалася, ён не хадзіў, а лятаў. Неаднойчы камунебудзь казаў: «Харошая вы жанчына, вось толькі павольна ідзяце».

Ён усё рабіў імкліва, хутка і адразу. Ніколі не адкладваў на потым, на дзень апошні. Ён быў шчыры і просты. Ён умеў дарыць радасць. Ён ніколі не быў стомленым, старым, хворым. Здаецца, аднойчы ўцёк з бальніцы праз адчыненае вакно.

Яго кнігамі мы зачытваліся і неаднойчы пыталіся: гэта вы пра сябе? Аляксей Нічыпаравіч нічога не адказваў, толькі загадкава ўсміхаўся.

А як ён размаўляў! Якая бліскучая, высакародная мова.

А як ён умеў жартаваць! Як мог смяяцца!

Усе святы ў музеі мы святкавалі разам з нашым дырэктарам. Ён апекаваў нас, клапаціўся, знаёміў з пісьменнікамі і мастакамі, з ціка вымі людзьмі. Гэта Аляксей Нічыпаравіч нас пазнаёміў з Уладзімірам Караткевічам, які падчас сустрэчы сказаў: «Гадоў 15 назад паганяў бы я вас па Наваградчыне, вы б у мяне як міленькая ведалі беларускую мову». Чалавек неардынарны, ён апярэдзіў свой час.

Нам проста пашанцавала ў жыцці, таму што лес даў нам такога дырэктара. Але лес яго і забраў. Назаўсёды. Аляксей Нічыпаравіч пай шоў ад нас, а мы мусілі працаваць далей, ствараць экспазіцыю, але на працягу некалькіх гадоў мы адчувалі яго маральную падтрымку.